крытыка

Васіль Жуковіч



...Чалавеку цяжка перарабіцца адразу.
Можна думаць і гаварыць іначай.
А сам чалавек доўга будзе ранейшым...

# Загадка класіка,

## *або таямніца «Лявона Бушмара» Кузьмы Чорнага*

Перачытваючы «Лявона Бушмара», я заўважыў парадаксальную рэч. «Зьвераватую панурасьць Лявону перадаў бацька – княжацкі дробны арандатар» – вось першы сказ гэтай неардынарнай аповесьці. Але ніякай зьвераватай бацькавай панурасьці ў творы зусім няма: «Гэта быў стары моцны, як дуб. Пражыў ён на сьвеце год, мусіць, з дзевяноста і рабіў усё да самых апошніх дзён сваіх. ...Доктара пры ім не было ніколі... Не любіў ён доктарскіх лекаў... Ня верачы ў дактароў, ён гаварыў, што чалавек павінен як мае быць працаваць, колькі трэба выспацца, у меру, смачна зьесьці – і тады будзе здароў».

Самавітая постаць, ці ня так? Пабольш бы такой «панурасьці» перадавалі генетычна бацькі сваім дзецям? Праўда, бацька не служыў у салдатах, грашыма адкупіўся, і Лявону радзіў «як-небудзь выкруціцца», не ісьці «служыць ліха ведае за што

чорту лысаму». Але ж чорту лысаму служыць ліха ведае за што хіба варта?..

Бацька перадаў сыну самавітасьць, цьвёрды характар, разважлівасьць, любоў да працы. Калі трапіў Лявон у войска, ён пакутаваў: «...Чорт ведае, чым займайся. Хіба гэта работа!» Сказана трапна, бо выверана самой псіхалогіяй цягавітага селяніна і чалавека, якому брыдка на кожным кроку падпарадкоўвацца.

У сваю апошнюю восень, 10 чэрвеня 1944 году, Кузьма Чорны зрабіў такі дзёньнікавы запіс: «Кожная тая кніга добрая, калі яна ўзьбівае чалавека на сталыя і важныя думкі». Якраз на такія думкі ўзьбівае «Лявон Бушмар» – унікальная аповесьць, якая даўно магла стаць нагодаю для разгадкі таямніцаў Чорнага крытыкамі і дасьледчыкамі літаратуры. Чаму адмоўны герой зьяўляецца ў творы галоўным? І, што асабліва цікава, ад пачатку і да канца расповяду ён не мяняецца ніколечкі, савецкі астрог яго не перавыхаваў. Тады чаму аповесьць названая яго імем? Відаць, справа ў тым, што Кузьма Чорны ня бегла, не наскокам закранае і паказвае праблему калектывізацыі ці, больш дакладна, яе наступствы. Гэты круты вар'яцкі паварот у жыцьці беларускае вёскі ён асэнсоўвае з асабліва заглыбленым пранікненьнем у сьвет чалавечых перажываньняў. У творы ніякія высновы не ляжаць на паверхні, бо ён глыбока псіхалагічны, у пэўным сэнсе філасофскі. Зусім ня выключана, што ўдумлівы пісьменьнік сваю пазіцыю, свой погляд на калектывізацыю праводзіў менавіта праз думкі Лявона Бушмара, не зважаючы на тое, што Бушмар і «зьвер», і «воўк», і забойца, і падпальшчык, і далёка не ідэальны сем'янін. Якраз т а к і творцу спатрэбіўся тып, відаць жа, невыпадкова, бо толькі за такім тыпам літаратурнага героя можна было надзейна прыхаваць сваю галоўную думку, сваю сапраўдную чалавечую пазіцыю. Паспрабуй у тыя гады (1929-1930), час стварэньня і апублікаваньня аповесьці, вымалюй станоўчага героя, які кінуў хоць бы неласкавы позірк на новыя парадкі... Нашчадкі ня ведалі б, дзе косьці замардаванага альбо расстралянага аўтара – на Калыме ці ў Курапатах. У тагачасных умовах суцэльнай "класавай барацьбы" можна было толькі так, выключна асьцярожна выяўляць грамадзянскую пазіцыю, выказваць хоць нейкую нязгоду з рэжымам, з тым, што спускаецца зьверху.

Калектывізацыя на Беларусі сталася насільлем над асобаю селяніна, яна разрывала даўнія традыцыі, парушала адвечную прывязанасьць вяскоўца да зямлі, наносіла страшэнны ўдар па сем'ях вяскоўцаў, па традыцыях народу, па народных песьнях, па нашай мове, яна пацьвярджала фальшывасьць, крывадушнасьць адной з галоўных дэкларацыяў савецкае ўлады: «Зямля – сялянам?» І хіба мог вялікі мастак слова абысьці такі гвалт?! Тым больш – ня мог яго адобрыць і, значыць, падтрымаць. Мог толькі асудзіць, вядома ж, у завуаляванай форме.

Дзіва дзіўнае: галоўны герой аповесьці – «зьвер», «воўк», а за яго лёсам, чытаючы твор, уважліва сочыш, яму ня зычыш ліха, больш за тое – за яго нават перажываеш (дарэчы, падобнае здараецца хіба, калі чытаеш Фёдара Дастаеўскага). Лявона Бушмара шкада, ён варты спачуваньня, бо ў яго бедах вінаваты ня столькі ён сам, колькі ўлада, рэжым, які ўчыняе гвалт, вераломна парушае адвечныя традыцыі.

Дарэчы, у тыя гады агульнанацыянальнае трагедыі Кузьму Чорнага

не абышла і асабістая драма. У дзёньнікавых запісах пісьменьніка гаворыцца пра гэта гранічна адкрыта: «У яжоўскай турме ў Менску мяне саджалі на кол, білі вялікім жалезным ключом па галаве, палівалі зьбітае месца халоднай вадой, паднімалі і кідалі на рэйку, білі паленам па голым жываце, устаўлялі ў вушы папяровыя трубы і раўлі ў іх на ўсё горла, уганялі ў камеру з пацукамі...» («Дзёньнік», 3 кастрычніка 1944). Увесь гэты набор садысцкіх прыёмаў таталітарнага рэжыму пісьменьнік зьведаў на сабе ў 1938 годзе, праз восем гадоў пасьля апублікаваньня «Лявона Бушмара».

Кузьма Чорны даверыў дзёньніку свае найбольш горкія думкі і высновы, высновы чалавека, які зьведаў на сабе рэпрэсіўную машыну сталіншчыны: «Беларускай інтэлігенцыі бадай што ўжо няма, а гэтыя носяць яе імя і сьціраюць з нашага жыцьця беларускі характар... Прыжывальшчыкі і хлебаеды». Тут ён называе найперш сумнавядомага Бэндэ і да яго падобных, якія лезьлі скрозь – «у беларускую крытыку», «у беларускую літаратуру», «у культуру і грамадскую дзейнасьць», «у мастацтва і цэнзуру» («Дзёньнік», 5 кастрычніка 1944 г.). Тут жа гаворыцца пра ўмовы, у якіх ня жыў, а толькі існаваў слынны творца: «Нічога не пісаў. Няма дзе падзецца і прыткнуцца з пяром. ...Я жыву на голай падлозе...» Пісьменьніку, які ў камуналцы дажывае жыцьцё, саўнаркам усё абяцае асобную кватэру. Апошні дзёньнікавы запіс (22 лістапада 1944 г.) засьведчыў сумныя перамены: «Бадай што ўжо месяц як у «кватэры», дадзенай мне Саўнаркомам. Але ж якраз як тая камера ў турме, дзе я сядзеў у 1938 годзе. Можна сказаць, што я ўжо дайшоў да апошняе мяжы. Бруд, цемень – вокны глядзяць у чорны трохкутнік з высозных муроў. Пісаць няма як і жыць няма як. А тут жа, па адным калідоры, рамантуюць кватэру Рыжыкаву. Там сьветла і добра».

Задумаемся: вось гэтая апошняя (тупіковая) мяжа пісьменьніка, ці не нагадвае чымсьці страчаную жыцьцёвую дарогу Лявона Бушмара і ці няма тут асацыяцыі з жахлівым бездарожжам нацыі ў вядомую эпоху, тым бездарожжам, якое, нават сыходзячы ў нябыт, імкнулася называцца шляхам?

Вернемся ж да самой аповесьці.

Кузьма Чорны свайго героя называе «воўк»... І міжволі падумалася пра ваўка, якога з усіх бакоў абкладваюць чырвонымі сьцяжкамі, каб яго зьнішчыць. Вось якраз такога ваўка нагадвае хутаранін Бушмар, моцны, цэльны, працаздольны і працалюбівы чалавек, які мае душу самастойную і вольную. У іншы час гэта мог бы быць цудоўны фермер!

Калі «вёска адціснула яго да самага лесу і ўрэзалася ў яго паплавы", ён, заўважым, стрымана (!), разважліва, але рашуча абураецца. Пісьменьнік дае цікавы дыялог, у якім адчуваецца, што ён тут на баку, так бы мовіць, адмоўнага героя:

— Чаму гэта залезьлі і сюды? – сыпаў ён злоснаю гаворкаю і паказваў рукой на лес.

– А як жа? На тое абрэзка, – адказвалі яму.

– Чаму гэта? – перапытваў ён. – Чаму гэта? Што, у мяне лішняе ёсьць, ці што? Можа, вы і на той бок палезеце.

– Можа, і палезем.

– Хто арэнду плаціў, а хто палезе? Чаму гэта?

У кароценькім урыўку ажно чатыры разы: «Чаму гэта?» І сапраўды: ч а м у ўчынялася г э т а? Такое пытаньне напэўна ўзьнікала ў мільёнаў людзей ні за што асуджаных на сьмерць ці пасаджаных у астрог, сасланых на Калыму... Ёсьць у аповесьці проста геніяльныя словы: «Чалавеку цяжка перарабіцца адразу. Можна думаць і гаварыць іначай. А сам чалавек доўга будзе ранейшым. Так, як ляцяць кожны год, абы толькі замакрэе вясновы сьнег, гусі над Бушмаравай сялібай, так, як адлятаюць яны гэтымі ж лясамі назад, абы толькі пацямнее ад старасьці на ржышчы белае павуціньне, — гэтак сваімі дарогамі будзе хадзіць чалавек, пакуль увесь узыдзе на дарогі іншыя". Ажно міжволі ўзгадваецца геній Скарына: «...тако ж і люді, ігде зродiліся і ускормлены суть по бозе, к тому месту велікую ласку імають».

У паэтычна-сьветлых і па-філасофску глыбокіх, мудрых радках знакамітага празаіка пра гусей над Бушмаравай сялібай, пра чалавека, яго дарогі ізноў жа адчуваецца пазіцыя мастака-гуманіста. Гусі ляцяць сюды кожны год. А вось Лявон Бушмар «больш у гэтую мясьціну не вярнуўся, зьнік. А шкада. Чалавечая драма мае свой пачатак, сваю гісторыю, сваю кульмінацыю. Тут згадваецца сказ з аповесьці: «Дарога з лесу, што з Бушмаравай сялібы падалася ўбок, закруцілася пад самую рэчку – новы перароблены вясковы палетак адапхнуў яе». Так згубілася жыцьцёвая дарога, адна з многіх жыцьцёвых дарог.

У спадчыне Кузьмы Чорнага ёсьць публіцыстычна завостранае апавяданьне «Справа Віктара Лукашэвіча», у якім герой, Лукашэвіч, адкрыта выступае супраць падхаліма і агрэсіўнага паклёпніка-ананімшчыка Марынковіча, што імкнецца «падфарбаваўшыся ў чырвоны колер, прыкрыўшыся рэвалюцыйнымі лозунгамі, сесьці сваім шырокім задам на ўсялякую жывую справу». Таму ў канцы твору намечаная параза паклёпніка.

Але як селянін-аднаасобнік, працалюб церпіць паразу ад калектывізацыі ў аповесьці «Лявон Бушмар», так і ў суровай жыцьцёвай рэчаіснасьці Кузьмы Чорнага сумленьне і талент бясьсільныя перад шматаблічнай поскуддзю «азіятчыны»: «Падхалімства, хабарніцтва, чыноўніцтва, паклёпніцтва – за апошнія гады паднялося на вялікую вышыню. Колькі нашай інтэлігенцыі бяз дай прычыны гніе ў турмах і на высылцы! Апарат НКГБ і тысячы чыноўнікаў займаюць увесь горад – яны ўмеюць і любяць рваць адзін аднаго і ўсіх за горла, а я гэтага ня ўмею рабіць, дык не магу нават дастаць хоць тоненькі праменьчык дзённага сьвятла ў вакно і мучуся ў пограбе. Божа, напішы за мяне раманы. Хіба так маліцца, ці што?» («Дзёньнік, 22 лістапада 1944 г.).

Такі стан грамадства, такі лёс класіка нацыянальнай літаратуры – хіба ня знак вялікай бяды, назва якой – нацыянальная драма?!